# ВА УНІВЕРСІТЭЦЕ — 11 СПЕЦЫЯЛЬНАСЦЕЙ,

*ЗНАЕМЦЕСЯ — НАШЫ ФАКУЛЬТЭТЫ:*

## ГІСТОРЫКА-ФІЛАЛАГІЧНЫ



ГІСТОРЫКА-філалагічны факультэт рыхтуе спецыялістаў трох профіляў: гісторыя, руская мова і літаратура, беларуская і руская мова і літаратура. Гэта не толькі настаўнікі сярэдніх спецыяльных і агульнаадукацыйных навучальных устаноў, але і будучыя даследчыкі ў галіне гісторыі і філалогіі (літаратуразнаўства і мовазнаўства).

Калектыў факультэта складаецца з вопытных навукова-педагагічных кадраў, 50 працэнтаў якіх — выкладчыкі з вучонымі ступенямі і званнямі. Сярод іх — два заслужаных дзеячы навукі БССР, доктары філалагічных навук, прафесары У. В. Анічэнка, М. М. Грынчык, прафесар М. В. Фёдарава, заслужаны работнік вышэйшай школы БССР Д. А. Лявончанка.

На факультэце чытаюцца спецыяльныя курсы, праводзяцца спецсемінары, ёсць адпаведныя секцыі НДРС. Для ўсіх студэнтаў факультэта прадугледжаны тры асноўныя практыкі: педагагічная (у школах горада і вобласці), вучэбна-вытворчая (археалагічная, архіўная, музейная, фальклорная, дыялекталагічная) і піянерская.

Для чытання лекцый і спецкурсаў на факультэт запрашаюцца буйнейшыя спецыялісты АН БССР і АН СССР, вучоныя вядучых ВНУ краіны.

Пры факультэце створаны і дзейнічаюць дзве навукова-даследчыя лабараторыі на грамадскіх пачатках па выкананню рэспубліканскіх дзяржбюджэтных тэм па фальклору Беларускага Палесся і беларускай лексікаграфіі (па складанню слоўніка Янкі Купалы і дыялектычнага слоўніка Гомельшчыны). На факультэце ажыццяўляецца штогодні выпуск двух міжвузаўскіх зборнікаў навуковых работ: «Беларуская літаратура» (пад рэд. праф. М. М. Грынчыка) і «Беларуская мова» (пад рэд. праф. У. В. Анічэнкі).

Факультэт жыве насычаным грамадскім жыццём. Для тых, хто любіць паэзію і спрабуе свае сілы ў літаратуры, адкрыта дарога ў літаб'яднанне «Крыніца».

Факультэт мае наступныя кафедры: гісторыі СССР і ўсеагульнай гісторыі (загадчык кафедры кандыдат гістарычных навук дацэнт **Г. С. Еўдакіменка**), беларускай літаратуры (загадчык кафедры доктар філалагічных навук прафесар **М. М. Грынчык**), беларускай мовы (загадчык кафедры доктар філалагічных навук прафесар **У. В. Анічэнка**), рускай літаратуры (загадчык кафедры кандыдат філалагічных навук **М. В. Родчанка**), рускай мовы (загадчык кафедры доктар філалагічных навук прафесар **М. В. Фёдарава**), англійскай мовы (загадчык кафедры кандыдат філалагічных навук **І. М. Акулаў**), нямецкай і французскай моў (загадчык кафедры кандыдат філалагічных навук дацэнт **В. Г. Рабенка**).

**Т. ЯЗЭПАВА,**
**кандыдат гістарычных навук,**
**дацэнт, дэкан факультэта.**



**НА ЗДЫМКУ: студэнты гістфіла за работай над складаннем слоўніка мовы Янкі Купалы.**

## БІЯЛАГІЧНЫ



ДАЛЕЙШАЕ развіццё біялагічнай навукі і ўмацаванне яе сувязі з практыкай вызначаюць вялікія задачы па падрыхтоўцы кадраў у галіне генетыкі, фізіялогіі, біяфізікі, біяхіміі, мікрабіялогіі і г. д.

Галоўная асаблівасць універсітэцкай адукацыі заключаецца менавіта ў грунтоўным веданні ўсіх біялагічных навук і ў далейшай спецыялізацыі на гэтай аснове ў галіне, адпавядаючай схільнасцям спецыяліста.

Біялагічны факультэт ГДУ рыхтуе спецыялістаў біялагічнага профілю з правам выкладання біялогіі і хіміі ў сярэдніх школах, тэхнікумах і вучылішчах, а таксама работнікаў для лабараторый, доследных станцый, запаведнікаў, навукова-даследчых устаноў.

Студэнты біяфака спецыялізуюцца па батаніцы (ухіл прамысловае кветкаводства), энтамалогіі і аховы раслін, фізіялогіі чалавека і жывёл, заалогіі (ухіл паляўніцтвазнаўства). Вучэбны працэс цесна звязан з навукова-даследчай работай. На факультэце створана студэнцкая навукова-даследчая лабараторыя па паляўніцтвазнаўству і паляўніцтваводству.

Вялікае значэнне ў падрыхтоўцы будучых спецыялістаў маюць вучэбныя і вытворчыя практыкі. Студэнты праходзяць іх на аграбіялагічнай станцыі «Чонкі», у экспедыцыях, батанічным садзе, Інстытуце фізіялогіі АН БССР, калгасах і саўгасах Гомельскай вобласці.

Вялікая ўвага на факультэце надаецца каардынацыі навукова-даследчай работы з АН СССР і АН БССР і наступнаму ўкараненню атрыманых вынікаў.

У склад факультэта ўваходзіць 4 кафедры: батанікі і фізіялогіі раслін (загадчык кафедры доктар сельскагаспадарчых навук прафесар **М. Ф. Харытановіч**), заалогіі і дарвінізму (загадчык кафедры доктар біялагічных навук прафесар **Б. П. Савіцкі**), фізіялогіі чалавека і жывёл (загадчык кафедры доктар біялагічных навук прафесар **Г. Б. Мялёхін**), хіміі (загадчык кафедры кандыдат хімічных навук дацэнт **Ю. А. Праляскоўскі**)

**Л. САПЕГІН,**
**кандыдат біялагічных навук,**
**дэкан факультэта.**

## ЭКАНАМІЧНЫ



ЭКАНАМІСТ — прафесія патрэбная і важная ў сучасным грамадстве. Камуністычная партыя і Савецкі ўрад шмат увагі надаюць павышэнню эканамічнай эфектыўнасці грамадскай вытворчасці, яе інтэнсіфікацыі, шырокаму ўкараненню электронна-вылічальнай тэхнікі і аўтаматызаваных сістэм кіравання, паляпшэнню эканамічнай адукацыі працоўных.

Сістэма эканамічных навук вывучаецца ва універсітэце на эканамічным факультэце, які з'яўляецца самым маладым і самым буйным. На факультэце вядзецца падрыхтоўка высокакваліфікаваных кадраў па спецыяльнасцях эканоміка працы і арганізацыя механізаванай апрацоўкі эканамічнай інфармацыі.

У час вучэбных заняткаў і ў перыяд практыкі на буйнейшых прамысловых прадпрыемствах і ў інфармацыйна-вылічальных цэнтрах Беларусі і краіны будучыя спецыялісты знаёмяцца з апошнімі дасягненнямі ў галіне эканомікі, тэхнічнага нармавання і навуковай арганізацыі працы, аўтаматызацыі кіравання вытворчасцю, эксплуатацыі вылічальнай тэхнікі, у тым ліку і электронна-вылічальных машын.

Тым, хто закончыць універсітэт па спецыяльнасці эканоміка працы, прадстаіць працаваць у аддзелах працы і зарплаты, навуковай арганізацыі працы і планава-эканамічных аддзелах прамысловых прадпрыемстваў, вытворчых аб'яднанняў, міністэрстваў і ведамстваў, у навуковых установах, ВНУ і тэхнікумах.



**НА ЗДЫМКУ: за навукова-даследчай работай студэнтка эканамічнага факультэта ленінская стыпендыятка дэпутат абласнога Савета народных дэпутатаў Людміла Краснагір.**

Выпускнікі па спецыяльнасці арганізацыя механізаванай апрацоўкі эканамічнай інфармацыі (АМАЭІ) будуць працаваць у інфармацыйна-вылічальных цэнтрах, аддзелах аўтаматызаваных сістэм кіравання і на машынавылічальных станцыях міністэрстваў, ведамстваў, а таксама ў навукова-даследчых установах, ВНУ і тэхнікумах.

На факультэце 4 кафедры: эканомікі працы (загадчык кафедры кандыдат сельскагаспадарчых навук дацэнт **У. Д. Арэшчанка**), арганізацыі механізаванай апрацоўкі эканамічнай інфармацыі (в. а. загадчыка кафедры кандыдат эканамічных навук **Г. А. Нарышаў**), галіновых навук (загадчык кафедры доктар эканамічных навук прафесар **С. А. Кім**), уліку і статыстыкі (загадчык кафедры доктар эканамічных навук прафесар **Л. І. Ільёў**).

**І. ТРАЦЭЎСКІ,**
**кандыдат эканамічных навук,**
**дацэнт, дэкан факультэта.**

## ФІЗІЧНЫ



У сучасным грамадстве адно з вядучых месц сярод грамадскіх і тэхнічных навук займае фізіка. Дасягненні асобных накіраванняў фізікі ў значнай ступені вызначаюць ролю і значэнне падрыхтоўкі спецыялістаў у вобласці фізікі на фізічным факультэце ГДУ.

Цяпер фізічны факультэт з'яўляецца буйнейшым факультэтам універсітэта, які рыхтуе спецыялістаў для работы ў навукова-даследчых інстытутах, навучальных установах, школах, фабрычна-заводскіх лабараторыях і канструктарскіх бюро краіны.

Падрыхтоўка студэнтаў ажыццяўляецца па наступных спецыялізацыях: радыёфізіцы, фізіцы цвёрдага цела, тэарэтычнай фізіцы, квантавай электроніцы, фізічнай метралогіі і электроніцы.

Усе студэнты атрымліваюць фундаментальную фізіка-матэматычную падрыхтоўку шляхам вывучэння агульных курсаў фізікі, вышэйшай матэматыкі, тэарэтычнай механікі, электрарадыётэхнікі, электрадынамікі, тэрмадынамікі, квантавай механікі і інш. Акрамя таго, студэнты праводзяць самастойныя практычныя заняткі ў вучэбных лабараторыях, якія абсталяваны па апошняму слову тэхнікі.

На першых двух курсах студэнты атрымліваюць глыбокую матэматычную падрыхтоўку, набываюць пэўныя навыкі фізічнага эксперыменту. Гэта дазваляе, пачынаючы з 3-га курса, выбраць адну з адпаведных спецыялізацый і глыбока аваладаць ёй на працягу наступных гадоў вучобы.

Падрыхтоўку будучых спецыялістаў праводзіць вялікі прафесарска-выкладчыцкі калектыў, у якім працуюць два доктары фізіка-матэматычных навук і 30 кандыдатаў фізіка-матэматычных і тэхнічных навук.

З кастрычніка 1976 года факультэт працуе па індывідуальнаму вучэбнаму плану, які максімальна ўлічвае запытанні прадпрыемстваў, зацікаўленых у падрыхтоўцы высокакваліфікаваных спецыялістаў па пэўнаму профілю. На гэтай аснове развіваюцца рознабаковыя сувязі са шматлікімі заводамі, навуковымі цэнтрамі рэспублікі і краіны. У 1978 годзе створана 6 філіялаў кафедр у НДІ, КБ і на заводах, а таксама вучэбна-навукова-вытворчае аб'яднанне. З 1977 года на факультэце дзейнічае галіновая навукова-даследчая лабараторыя электрадынамікі складаных сістэм, а таксама цэнтр па апрацоўцы ядзернай фільмавай інфармацыі сумесна з ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга Інстытутам фізікі АН БССР.

Прафесарска-выкладчыцкі састаў праводзіць навукова-даследчую і гасдагаворную работу. Вынікі даследаванняў штогод дакладваюцца на міжнародных, усесаюзных, рэспубліканскіх, універсітэцкіх навуковых канферэнцыях, змяшчаюцца ў навуковых часопісах.

Уся вучэбна-выхаваўчая і навукова-даследчая работа на факультэце ажыццяўляецца на сямі кафедрах: оптыкі (загадчык кафедры член-кар. АН БССР, прафесар, заслужаны дзеяч навукі БССР **Б. В. Бокуць**), агульнай фізікі (загадчык кафедры кандыдат ф.-м. навук **В. С. Стрыжнеў**), тэарэтычнай фізікі (загадчык кафедры кандыдат ф.-м. навук дацэнт **М. В. Максіменка**), фізікі цвёрдага цела (загадчык кафедры кандыдат тэхн. навук дацэнт **В. А. Балакін**), радыёфізікі (загадчык кафедры кандыдат ф.-м. навук дацэнт **І. Ф. Дабравольскі**), фізічнай метралогіі (загадчык кафедры кандыдат тэхн. навук дацэнт **В. П. Стаўроў**), вышэйшай матэматыкі (загадчык кафедры кандыдат ф.-м. навук дацэнт **І. І. Старун**).

**У. МАЦЮШЭНКА,**
**кандыдат тэхнічных навук,**
**дацэнт, дэкан факультэта.**

